нацыянальнага руху і значна прасунулі наперад яго палітычныя патрабаванні. У гэты час фактычна фарміруюцца ўсе галоўныя ідэалагічныя плыні беларускага нацыянальнага руху і выпрацоўваюцца асноўныя падыходы да праблемы ўвасаблення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

Выкарыстаная літаратура


1. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 510 с.
2. Жылуновіч З. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 сакавіка 1917г. // Полымя. – 1925. – № 6.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60. – Воп. 3. – Сп. 151. – Арк. 3.
4. А.І. Усходняя Беларусь: Статыстыч. і гіст. матэрыялы. / А. І. – Мінск., 1918. – 56 с.
5. Парэчын, Г. Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі.// Запіскі адзелу гуманітарных навук: Працы кафедры сучаснага права. / Г. Парэчын – Мінск, 1929. – Т. 1.
6. Кнорин В. 1917 в Белоруссии и на Заподном фронте. / В. Кнорин – Мінск., 1925. – 182 с.
7. Рудовіч С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці (1917 г.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4.
8. НАРБ. – Ф. 60. – Воп.3 – Сп. 338. – Арк. 7.


## ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА І ЯГО АДНОСІНЫ ДА ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ І ПРАВА

Саракавік І.А.г. Мінск, Акадэмія кіравання пры
Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка (1746 – 1817 гг.) больш вядомы як кіраўнік паўстання 1794 г. і менш сваімі поглядамі на дзяржаўнасць і права. Яны выкладзены ў шэрагу яго прац. У «Мемарыяле аб Польшчы» (1793 г.) Касцюшка адзначыў значнасць і ролю Французскай рэвалюцыі ў распаўсюджванні па ўсёй Еўропе прынцыпаў свабоды і роўнасці. У той жа час, перамога Французскай рэвалюцыі, лічыў Касцюшка, гэта аснова новага дзяржаўнага ладу Польшчы. Тут жа ён выклаў праграму рэвалюцыйнай перабудовы Рэчы Паспалітай на рэспубліканскіх,

антыфеадальных пачатках. Ён лічыў, што ў выніку пераможнай рэвалюцыі павінны адбыцца ліквідацыя каралеўскай улады, чыноў вышэйшага духавенства; скасаванне Сената, свабода і роўныя правы для ўсіх; атрыманне кожным чалавекам, незалежна ад месца пражывання, паходжання, саслоўя ці веравызнання, свабоды набываць ці валодаць нерухомай маёмасцю; права выбіраць і быць выбраным на ўсе дзяржаўныя пасады тымі, хто валодае нерухомай маёмасцю ці плаціць падатак; поўная ліквідацыя прыгоннага стану сялян, узбраенне ўсяго народа; «каронныя маёнткі, староствы і царкоўныя ўладанні павінны служыць для ўтрымання войска» [1, с. 506 – 507].

7 мая 1794 г. у лагеры пад Паланцом Т. Касцюшка выдаў вядомы «Паланецкі ўніверсал». З аднаго боку, гэта была ў пэўнай ступені праграма дзеянняў новых сіл Польшчы, з другога – рэакцыя на заклік «маскалёў», як значылася ў нарматыўным акце, да сялян выступіць супраць тых, хто паўстаў, грабіць маёнткі паноў, якія ажыццяўляюць супраць іх дэспатызм. Пацвярджэннем апошняму з'яўляецца прызнанне ў гэтым акце Т. Касцюшкі лютага абыходжання памешчыкаў з простым народам, што «часта дае аснову маскалям асуджаць усю нацыю. Сведчаннем таму – скаргі ад салдат і рэкрутаў, што іх жонкі і дзеці не атрымліваюць ніякай дапамогі» [1, с. 519 – 514].

У сувязі з гэтым Т. Касцюшка даручыў камісіям кіравання ваяводствамі і землямі давесці да ўсіх памешчыкаў, гаспадароў маёнткаў і служачых, іх замяняючых, распараджэнне, у якім значылася, што просты народ, згодна закону, знаходзіцца пад апякунствам урада краіны; асоба кожнага селяніна свабодна і ён мае права перасяліцца туды, куды пажадае, заплаціўшы падаткі. Артыкул 3 акта ўстанаўліваў льготы пры адбыванні паншчыны: той, хто працаваў 5 ці 6 дзён у тыдзень, павінен працаваць на 2 дні менш; той, хто працаваў 2, 3 ці 4 дні у тыдзень, павінен працаваць на 1 дзень менш; той, хто працаваў у тыдзень адзін дзень, павінен працаваць адзін дзень у два тыдні. Аднак гэта ільгота распаўсюджвалася толькі на перыяд паўстання.

Менавіта інтарэсы паўстання прывялі да таго, што артыкулы 4 і 5 акта падтрымлівалі тых, хто прымаў у ім удзел: яны вызваляліся ад паншчыны, а пра іх гаспадарку павінны былі паклапаціцца мясцовыя ўлады. У артыкулах 7 і 8

прадугледжвалася пакаранне прадстаўнікоў мясцовых органаў улады і памешчыкаў, якія парушалі гэта распараджэнне.

«Паланецкі ўніверсал» прадугледжваў таксама дзейнасць мясцовых органаў улады і ўтвораных новых органаў паўстання – камісій кіравання і дазорных упраўленняў (арт.10 – 12) [1, с. 520 – 524; 2, с. 664 – 666].

Такім чынам, гэтым актам устанаўліваліся мясцовыя органы ўлады, рэгуляваліся адносіны паміж сялянамі і памешчыкамі, паміж імі і ўладнымі ўстановамі, гарантавалася апека ўрада над сялянамі і яны абвяшчаліся асабіста вольнымі, але зямлі не атрымалі. Гэтым актам кіраўнік паўстання хацеў прыцягнуць сялян да выступлення супраць царскага самаўладдзя.

Тут неабходна заўважыць, што яшчэ задоўга да прыняцця Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Т. Касцюшка выказаў сваё незадавальненне прыгонным правам. Пазней, 2 красавіка 1817 г., у сваім тастаменце ён запісаў: «Глубоко чувствуя, что крепостное состояние противоречит закону природы и благополучию народов, я свидетельствую настоящим, что уничтожаю его полностью и на вечные времена в моем имении Сехновичи в Брест-Литовском воеводстве как от моего имени, так и от имени будущих его владельцев» [1, с. 500, 538].

У той жа час ён не хацеў адштурхнуць ад паўстання шляхту, якая, валодаючы пэўнымі матэрыяльнымі і фінансавымі сродкамі, магла падтрымаць выступленне за незалежнасць Польшчы, і таму не адмяніў прыгоннае права.

Заслугоўвае ўвагі і артыкул Т. Касцюшкі «Дозоры» у газеце «Дневник народного восстания» у трэцім нумары за 1794 г. У ім аўтар правамерна заўважыў, што правасуддзе неабходна аддаць «в те руки, которые нас кормят и охраняют». Калі ж пакінуць усё, як ёсць цяпер, «в руках тех, которые всегда были его тиранами, он (народ. – І. С.) не поверит ни в правосудие, ни в данную ему свободу и не пойдет в доблестном порыве защищать их». На яго погляд, «правосудие – это основа свободы. Без правосудия свобода является болезнью для общества». Тут жа ён прапанаваў прыкласці намаганні для выкаранення таго, «что всегда было вреднейшим недостатком поляков. Писали законы, но никогда не следили за их исполнением…».

У гэтым артыкуле Т. Касцюшка выступіў супраць несправядлівасці, у падтрымку сялян, простага народа. «Гнев начинает раздирать сердце, – піша ён, – когда тиран, чтобы умножить свою роскошь, вырывает из рук крестьянина то, что он приготовил для своих голодных детей. Все дани, подати и барщинные работы зависели от каприза пана». Т. Касцюшка быў перакананы, што «правительство, как наивысшая опека народного счастья, невзирая на убытки, понесенные частными лицами, должно искоренить тиранию, уничтожить несправедливость, подавляя непослушание и усмиряя своеволие землевладельцев…

Правительство должно быть одинаково благосклонно ко всем, каждому предоставляя свободу вероисповедования. Нужно, чтобы в этом правительство подражало самому небу, которое, как говорит Фенелон, имея под собой разных людей, всем одинаково посылает свет и влагу» [1, с. 525 – 528].

На працягу ўсёй сваёй палітычнай дзейнасці Т. Касцюшка імкнуўся быць паслядоўным прадаўжальнікам ідэй Ж.Ж. Русо, Ш. Мантэск’е, Т. Джэферсана і іншых прагрэсіўных дзеячоў. Яго дзяржаўна-прававыя і грамадска-палітычныя погляды найбольш поўна былі выкладзены ў брашуры «Ці могуць палякі дабіцца незалежнасці?», выдадзенай у 1800 г. у Парыжы. У ёй важна яго палажэнне аб тым, што першай крыніцай заняпаду дзяржавы з’яўляецца страта народам сілы духу і веры ў сябе, а таксама антынародная палітыка магнатаў, калі яны пачалі «імкнуцца не да дабрабыту, а да задавальнення ганарыстасці магнацкіх прозвішчаў… Магнаты былі зацікаўлены ў тым, каб пераканаць нацыю ў яе нікчэмнасці і слабасці, упэўніць яе ў тым, быццам яна нічога не можа дасягнуць сваімі ўласнымі сіламі, без дапамогі суседняй дзяржавы, бо яны ўзбагачаліся, гандлюючы яе крывёю ля падножжа тронаў. Магнаты былі зацікаўлены ў аслабленні духу сваіх суайчыннікаў, у прыніжэнні іх годнасці для таго, каб, не ведаючы сваёй сілы, яны не маглі скінуць з сябе ганебнай апекі, у адваротным выпадку магнаты страцілі б увесь свой уплыў і аўтарытэт» [3, с. 232–233]. Значыць, галоўнай прычынай заняпаду Рэчы Паспалітай ён лічыў класавыя супярэчнасці, антынародную палітыку магнатэрыі дзяржавы.

Адначасова Т. Касцюшка крытыкаваў феадальна-памешчыцкі лад, адзначаючы, у прыватнасці, што ў дзяржаве, дзе

ёсць урадлівыя землі, сяляне амаль паміраюць ад голаду і нястачы, слаба развіта прамысловасць, рамяство, навука, а «шляхта ўмела толькі тыраніць сялян». У той жа час ён быў прыхільнікам неабходнасці захавання і аховы права прыватнай уласнасці, буржуазных пераўтварэнняў у краіне. Ён лічыў, што, «хоць прынцыпы свабоды і роўнасці дапускаюць усіх аднолькава да займання ўрадавых пасад, аднак … я б жадаў, каб асобы, якія зоймуць месцы ва ўсіх магістратурах, былі абраны з ранейшых саслоўяў».

Важнымі з'яўляюцца яго разважанні наконт суадносін свабоды і законнасці. Згодна з імі, «рэвалюцыя праводзіцца не для таго, каб зняць усякую аброць са свавольства, наадварот, яна ставіць сабе за мэту ўстанавіць парадак, падпарадкаваць закону ўсякія правапарушэнні, прывучыць падпарадкоўвацца ўладам, устаноўленым нацыяй, ахоўваць уласнасць кожнага, якая складае аснову грамадства. Усім даюцца аднолькавая свабода і роўныя правы, але нікому не дазваляецца ўчыняць злачынствы… Правасуддзе павінна быць пагрозай для злачынцаў, але не помстай; невінаватым жа яно служыць прытулкам. Тыя, хто думае, што важней не ўпусціць злачынцаў, чым стварыць бяспеку невінаватым, робяць жудасную памылку… Хто не паважае ўстаноўленай над ім улады, парушае правы нацыі, учыняе крыўды і грабяжы, той разбойнік і злодзей. Рэвалюцыя якраз і ставіць сабе за мэту выпраўленне заган, знішчэнне злачынстваў і ўкараненне ў сэрцы ўсіх грамадзян міласэрнасці і дабрадзейнасці» [3, с. 233].

Т. Касцюшка Т. лічыў вельмі важным правядзенне шырокай асветы насельніцтва, якая дазваляла б яму актыўна ўдзельнічаць у заканадаўстве. Ён пісаў, што да рэвалюцыі французы не займаліся грамадскімі справамі, а «калі яны атрымалі права ўдзельнічаць у заканадаўстве, то пачалі вучыцца яму і думаць над інтарэсамі нацыі», бо заканадаўства патрабуе вялікіх ведаў.

Прагрэсіўна яго палажэнне і аб тым, што ўсе сацыяльныя слаі насельніцтва і, так званыя, ніжэйшыя, а не толькі каралеўская ўлада і шляхта, маюць права ў вырашэнні дзяржаўных праблем. Не без падстаў, гаворачы пра каралеўскую ўладу і шляхту, ён пытае: «Кожны ведае, што яны не валодаюць прывілеяваным розумам; чаму ж яны прысвоілі сабе права распараджацца лёсам нацый без іх волі?».

Т. Касцюшка звярнуў увагу і на такую сацыяльную праслойку грамадства, як бадзягі, п’яніцы, дармаеды. Па яго меркаванню, да іх трэба адносіцца сурова і неабходна выкарыстоўваць на грамадскіх работах, будаўніцтве дарог, каналаў, брукаванні вуліц у гарадах з выплатай памяркоўнай узнагароды.

Заслугоўвае ўвагі і яго палажэнне наконт таго, што незалежнасці можна дасягнуць толькі на аснове ўласных намаганняў. Т. Касцюшка перакананы, што «надежда на чужеземцев ничего не даст», і не без падстаў задае пытанне: «Есть ли страна в мире, которая достигла высокой ступени славы под чужой опекой?». Ці яшчэ: «Мало обнаружить стремление к порядку и справедливости, нужно еще обладать мужеством, чтобы отстоять их». [1, с. 540, 544].

Гэтыя дзяржаўна-прававыя ідэі Т. Касцюшка лічыў неабходнай умовай для перамогі рэвалюцыі ў Рэчы Паспалітай. Аднак унутрыпалітычнае становішча ў дзяржаве, расстаноўка палітычных сіл унутры яе прымушалі яго ў ходзе паўстання 1794 г. узгадняць свае дзеянні са шляхтай і мяшчанамі і да часу не поўнасцю прытрымлівацца сваіх дзяржаўна-прававых поглядаў.

Прававыя і палітычныя ідэі Т. Касцюшкі вызначылі новае накіраванне ў палітычнай барацьбе ў Рэчы Паспалітай і садзейнічалі падрыхтоўцы і зараджэнню рэвалюцыйнага дэмакратычнага руху ў Польшчы, Беларусі і Украіне.

Выкарыстаная літаратура

1. Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. Т. 1. – М.: Госиздат полит. лит., 1956. – 784 с.

2. Костомаров, Н.И. Старый спор (Последние годы Речи Посполитой) / Н.И. Костомаров. – М.: Чарли, Смоленск: Смядынь, 1994. – 768 с.

3. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 671 с.